# З ГІСТОРЫІ КАМСАМОЛА ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

**У гэтым годзе Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі спаўняецца 70 гадоў.**

29 кастрычніка 1918 г. ў Маскве адкрыўся І з'езд Саюза рабочай і сялянскай моладзі. Дзень адкрыцця з'езда стаў днём нараджэння камсамола.

Пасля з'езда паўсюдна ў краіне ствараліся камуністычныя саюзы моладзі. Утварыліся яны і на тэрыторыі Гомельшчыны. Тут рэвалюцыйныя саюзы рабочай і сялянскай моладзі ўзніклі яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. У перыяд нямецкай акупацыі асобныя гурткі рабочай моладзі дзейнічалі ў Гомелі, Мазыры, Рэчыцы. Аднак шырокі размах маладзёжны рух прыняў толькі пасля выгнання нямецкіх акупантаў. Першы арганізацыйны сход юнакоў і дзяўчат г. Гомеля адбыўся 4 лютага 1919 г.

Першая палова 1919 г. была перыядам стварэння камсамольскай арганізацыі на тэрыторыі Гомельшчыны. У гэты час узніклі маладзёжныя арганізацыі ў Добрушы, Рагачове, Карме, Лоеве, Петрыкаве і іншых месцах Гомельшчыны.

Для аб'яднання гарадскіх і сельскіх камсамольскіх ячэек у адзіную губернскую быў скліканы І з'езд камсамола Гомельшчыны. Ён адкрыўся 2 чэрвеня 1919 г. і працаваў тры дні. На 1-м Гомельскім губернскім з'ездзе прысутнічалі 40 дэлегатаў ад 16 паветаў, якія прадстаўлялі 1146 камсамольцаў губерні. Сярод дэлегатаў было 8 членаў РКП(б) і 9 спачуваючых. З'езд працаваў у будынку на Савецкай вуліцы, дзе цяпер знаходзіцца Гомельскі гарком камсамола.

І Гомельскі губернскі з'езд аб'яднаў гарадскія і сельскія ячэйкі ў адзіную губернскую арганізацыю. Пасля з'езда Гомельская губернская арганізацыя РКСМ стала развівацца хуткімі тэмпамі. Да восені 1919 г. яна вырасла да пяці тысяч чалавек.

**В. ЛУГАЎСКАЯ,**
заг. аддзела аблдзяржархіва.

*У Цэнтральным раённым камітэце народнага кантролю*

# АБ СУР'ЁЗНЫХ НЕДАХОПАХ У АРГАНІЗАЦЫІ ХАРЧАВАННЯ СТУДЭНТАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

У канцы мінулага года на працягу дзесяці дзён прадстаўнікі Цэнтральнага раённага камітэта народнага кантролю сумесна з пастаяннай камісіяй раённага Савета народных дэпутатаў па грамадскаму харчаванню і гандлю правяралі арганізацыю харчавання студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ. Яе вынікі абмеркаваны на пасяджэнні раённага камітэта НК 19 студзеня 1988 г. У прынятай пастанове адзначаецца, што адміністрацыяй сталовай № 40 (загадчыца Т. М. Соцiева) і кіраўніцтвам дзяржуніверсітэта (прарэктар па АГР П. М. Навуменка) не прыняты вычарпальныя меры па забеспячэнню гарачым харчаваннем студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. У сталовай не праводзіцца работа па ўдасканальванню абслугоўвання і арганізацыі харчавання. Недастатковы асартымент страў. Не хапае свежых гародніны, фруктаў, напіткаў, высокаякасных мясных, каўбасных і рыбных страў. На кожны буфет штодзённа выдавалася ўсяго толькі па 80 булачак і 30 піражкоў. Не арганізаваны разносны гандаль кандытарскімі вырабамі ў вучэбных карпусах і інтэрнатах. Не ўкараняюцца прагрэсіўныя формы: комплексныя абеды, малочныя і гароднінныя сталы, папярэдняя раскладка закусак і сервіроўка, падрыхтоўка складаных гарніраў, сталы самаразліку, разносны гандаль і г. д.

Рыхтуемыя стравы не заўсёды якасныя, маюць месца факты недакладу сыравіны. У сталовай і буфетах сістэматычна парушаўся санэпідэмрэжым. За парушэнне санітарных правіл за 1987 год аштрафавана 11 работнікаў сталовай і 14 — буфетаў. Нізкая агульная культура персаналу.

Адміністрацыйна-гаспадарчая частка універсітэта (П. М. Навуменка) дрэнна падрыхтавала пункты грамадскага харчавання да новага навучальнага года. Запланаваныя мерапрыемствы па рамонту сталовай і буфетаў, аснашчэнню іх неабходным тэхналагічным абсталяваннем засталіся нявыкананымі. Пры праверцы выяўлены затопленыя каналізацыйнымі сцёкамі падвальныя памяшканні. На дзень праверкі не была гатова да работы дыетычная зала сталовай, дзе няспраўнае тэхналагічнае і халадзільнае абсталяванне, не праведзены бягучы рамонт памяшкання. З-за нездавальняючага санітарна-тэхнічнага стану Дзяржсаннаглядам у маі 1987 г. была забаронена эксплуатацыя буфета ў галоўным вучэбным корпусе. Яго рамонт і аснашчэнне абсталяваннем своечасова не праведзены.

З-за няспраўнасці і адсутнасці тэхналагічнага і халадзільнага абсталявання не функцыяніруюць буфеты ў вучэбным карпусах №№ 1, 2.

Рэктаратам універсітэта і прафкомам не выконваецца пастанова ЦК КПБ і Белсаўпрофа № 191 ад 27.05.87 г. аб арганізацыі аднаразовага гарачага харчавання для студэнтаў па медыцынскіх паказчыках са скідкай 50% кошту.

Кіраўніцтва трэста рэстаранаў і кафэ (дырэктар Л. Я. Самахвалава) слаба кантралюе работу універсітэцкай сталовай і буфетаў. Не вырашана пытанне іх укамплектавання персаналам. У трох буфетах з шасці няма буфетчыц, у пяці — пасудамыек.

Становішча, якое склалася з арганізацыяй харчавання, выклікае справядлівыя скаргі студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Раённы камітэт адзначыў, што групы народнага кантролю трэста рэстаранаў і кафэ (старшыня В. В. Іванькова) і дзяржуніверсітэта (Ю. А. Пралясkоўскі) слаба ажыццяўляюць кантроль за работай сталовай і буфетаў.

За нездавальняючую арганізацыю харчавання студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, незабеспячэнне гатоўнасці сталовай і буфетаў да работы ў 1987—88 навучальным годзе загадчыца сталовай № 40 Т. М. Соціева і прарэктар дзяржуніверсітэта П. М. Навуменка заслугоўваюць сур'ёзнага спагнання, але, улічваючы непрацяглы час работы на займаемых пасадах, раённы камітэт народнага кантролю абмежаваўся іх абмеркаваннем.

Звернута ўвага дырэктара трэста рэстаранаў і кафэ Л. Я. Самахвалавай на адсутнасць пастаяннага кантролю за арганізацыяй належнага харчавання ва універсітэце.

Раённы камітэт народнага кантролю абавязаў загадчыцу сталовай № 40 Т. М. Соціеву, дырэктара трэста рэстаранаў і кафэ Л. Я. Самахвалаву, прарэктара дзяржуніверсітэта П. М. Навуменку прыняць неадкладныя меры па ўхіленню ўскрытых недахопаў і забеспячэнню гарачым харчаваннем студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта і аб праведзенай рабоце паведаміць РК НК да 1-га сакавіка 1988 года.

*Па слядах нашых выступленняў*

# «НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ»

**У папярэднім нумары нашай газеты была змешчана крытычная заметка пад рубрыкай «Нельга маўчаць», у якой загадчык кафедры палітэканоміі дацэнт У. Ф. Бондараў пісаў аб несумленнасці некаторых студэнтаў універсітэта ў час здачы экзаменаў — выкарыстанні імі шпаргалак. Закранутая тэма не пакінула чытачоў газеты абыякавымі. Так, рэдакцыя атрымала пісьмо, у якім аўтар (на жаль, ён пажадаў застацца невядомым і паставіў толькі свае ініцыялы — С. М.) выказаў сваю думку гледжання па дадзенаму пытанню. У канцы свайго допісу ён зрабіў прыпіску: «Хацелася б, каб мой пункт гледжання вынеслі на абмеркаванне на старонках газеты». Прапанова аўтара здалася нам слушнай. Сапраўды, няхай выкажуць свае меркаванні аб такой з'яве ў студэнцкім асяроддзі, як «шпаргальства» іншыя юнакі і дзяўчаты. Ніжэй мы змяшчаем дасланае ў рэдакцыю пісьмо і чакаем ад вас, паважаныя чытачы, вашых думак адносна ўзнятай праблемы.**

— Прачытаў артыкул пад рубрыкай «Нельга маўчаць». У ім ішла размова аб тым, што добра падрыхтаваныя студэнты таксама не супраць праявіць несумленнасць пры здачы экзаменаў. Але паўстае пытанне: «Як жа здаюць экзамены тыя, у каго бягучыя адзнакі не перавышаюць 3 балаў?» Няўжо ім удаецца ўсё вывучыць за 3—4 дні перад экзаменам? Справа ў тым, што спісванне працвітае і калі называць тых, каго выпадкова «злавілі», гэта не значыць, што вядзецца барацьба з гэтай з'явай.

Цяпер у нас паўсюдна вядуцца размовы аб маральным, матэрыяльным стымуляванні. Але чамусьці сістэмы адукацыі гэта не датычыць. Адны студэнты цэлы курс навучання добрасуленна займаюцца, але па волі выпадку атрымліваюць адзнакі, якія не адпавядаюць іх ведам. А другія — гуляюць семестр за семестрам, у час сесіі — таксама не надта сябе перагружаюць: акуратна спісалі — і выдатная адзнака забяспечана. А чаму ніхто не пацікавіцца, чым гэты студэнт займаўся ў час вучобы? Хацелася б звярнуць у сувязі з гэтым увагу выкладчыкаў на тое, каб яны прымалі экзамен у студэнтаў дыферэнцыравана: улічвалі пропускі студэнтамі вучэбных гадзін, іх адказы на практычных занятках, на працягу ўсяго семестра. Калі гэта двоечнік, то і спытаць з яго неабходна больш строга, па ўсяму курсу, а не толькі па 2—3 пытаннях экзаменацыйнага білета. Тады справа, я ўпэўнены, пойдзе лепш і якасць ведаў значна ўзрасце.

*Запланаваў жансавет*

# ДЛЯ АГУЛЬНАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦІ

З карысцю, цікава правесці вольны час выкладчыцам і супрацоўніцам прапаноўвае жансавет ГДУ. На чарговым яго пасяджэнні, якое адбылося нядаўна, ім вырашана адкрыць ва універсітэце клуб «Сустрэча сяброў», які будзе працаваць у памяшканні кафэ па вул. Песіна. Першую сустрэчу ў ім запланавана правесці ў бягучым месяцы — 27 лютага. Пры падрыхтоўцы гэтага мерапрыемства жансавет улічыць прапановы, якія выкажуць на старонках універсітэцкай шматтыражнай газеты яе чытачы. Каго з цікавых людзей запрасіць на пасяджэнні клуба, якія формы выкарыстоўваць па арганізацыі гэтых сустрэч, іншыя думкі чытачоў дапамогуць жансавету весці сваю работу з улікам пажаданняў і жанчын, і мужчын ГДУ.

У жансавет уваходзяць выкладчыцы і супрацоўніцы розных факультэтаў, структурных падраздзяленняў. З улікам гэтага і складаўся план яго работы на бягучы год. Так, жанчыны, якія працуюць на гісторыка-філалагічным факультэце, будуць праводзіць у студэнцкім кафэ пасяджэнні літаратурнай гасцінай, факультэта фізічнага выхавання — заняткі спортам пад назвай «Прыгажосць для ўсіх» (па нядзелях у спартыўнай зале першага вучэбнага корпуса). На эканомфаку ствараецца клуб «Золушка». Тыя, хто пажадае хадзіць на яго пасяджэнні кожную трэцюю пятніцу месяца (галоўны корпус, аўд. 3—7), навучацца кулінарнаму майстэрству, прыгожай сервіроўцы святочнага стала, вязанню на спіцах, прутках, шыццю.

Аб датах, часе правядзення ўсіх мерапрыемстваў, арганізаваных жансаветам для культурнага адпачынку калектыву ГДУ, будзе паведамляцца на старонках нашай газеты.

Усе, хто жадае выказаць свае прапановы жансавету ў справе арганізацыі вольнага часу жанчын і іх сем'яў, могуць адрасаваць іх у рэдакцыю газеты «Гомельскі універсітэт». Можна таксама пазваніць па тэлефоне: 57-16-52.

**Т. ДУБЯК,**
член жансавета ГДУ.

# ДА ЎВАГІ ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў у лютым 1988 г.**

**1. Дэмакратызацыя — сутнасць перабудовы, сутнасць сацыялізму.**

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці вывады і ўстаноўкі, якія змяшчаюцца ў выступленні М. С. Гарбачова на сустрэчы ў ЦК КПСС з кіраўнікамі сродкаў масавай інфармацыі, ідэалагічных устаноў і творчых саюзаў (гл. газету «Правда» за 13 студзеня 1988 г.).

**2. Заўсёды на варце** (да 70-годдзя Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту).

Матэрыялы публікуюць усе газеты. Гл. таксама часопіс «Агитатор» № 1 за 1988 год.

**3. Ініцыятыве правафланговых дзелавую падтрымку** (аб шырокай падтрымцы працаўнікамі горада і вёскі патрыятычнага пачыну перадавых калектываў па разгортванню сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі).

Матэрыял публікуе «Звязда». Гл. таксама газету «Труд» за 14 студзеня, часопіс «Агитатор» № 2 за 1988 г.

**4. Шанаваць гонар змалаздa** (аб адказнасці сям'і, школы і грамадскасці за фарміраванне ў моладзі імкнення жыць і дзейнічаць па законах гонару, сумлення і справядлівасці, за выхаванне ў яе нецярпімых адносін да любых адступленняў ад маральных норм нашага грамадства).

«Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

**5. Ахоўваць прыроду — наш агульны дом** (аб доўгу і абавязку працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый, усіх савецкіх людзей весці актыўную барацьбу за зберажэнне і прымнажэнне прыродных рэсурсаў, за аздараўленне экалагічнай абстаноўкі).

У гутарках і палітінфармацыях на гэту тэму рэкамендуецца выкарыстоўваць палажэнні і ацэнкі, змешчаныя ў пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб карэннай перабудове справы аховы прыроды ў краіне», апублікаванай 17 студзеня г. г. у цэнтральным і рэспубліканскім друку.

**6. У будучае стагоддзе—без ядзернай зброі** (барацьба за ўсталяванне новага палітычнага мыслення ў міжнародных адносінах, за ліквідацыю небяспекі атамнай пагрозы, забеспячэнне мірнай будучыні чалавецтва — асноўны напрамак знешнепалітычнай дзейнасці КПСС і Савецкай дзяржавы).

Матэрыялы апублікаваны ў часопісе «Коммунист» № 1, штотыднёвіку «За рубежом» № 3 за 1988 год. Гл. таксама артыкулы і публікацыі ў цэнтральным і рэспубліканскім друку ў сувязі з двухгоддзем Савецкай праграмы ядзернага разбраення.

**7. Капіталізм 80-х у цісках вострых эканамічных праблем** (аб новых крызісных з'явах у эканоміцы заходняга свету).

Матэрыял апублікаван у штотыднёвіку «За рубежом» № 2 за 1988 г.

*Да 150-годдзя з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага*

# АДСТОЙВАЦЬ У САБЕ ЧАЛАВЕКА

Ёсць у гісторыі кожнай краіны людзі, якія складаюць гонар, славу сваёй нацыі, народа. У беларусаў такімі з'яўляюцца слынны Францыск Скарына, легендарны Кастусь Каліноўскі, песенны Я. Купала. Усіх іх яднае любоў да Радзімы, адданасць, служэнне ёй да канца дзён сваіх. Справа кожнага з іх для сваёй эпохі — гэта цэлая рэвалюцыя, той узрыў чалавечага духу, які абавязкова дае плён, сее новыя ўсходы, даруючы ўзамен бессмяротнасць.

Аб гэтым асабліва не задумваешся ў штодзённым жыцці. Але бываюць даты. Яны, як строгі напамін, вяртаюць да роздумаў, да асэнсавання велічы зробленага, лепш сказаць нават, здзейсненага такімі людзьмі.

Ён быў зусім малады, гэты няўрымслівы і апантаны ідэяй вызвалення народа Кастусь Каліноўскі (нарадзіўся ў фальварку Мастаўляны Гродзенскага павету 21 студзеня (ст. ст.) 1838 г.), калі звяртаўся да прыніжаных, схіленых у рабскай пакоры, землякоў: «Няма чаго ждаць ад нікога, бо той толькі жне, хто пасее. Так сейце ж, дзецюкі, як прыйдзе пара, поўнаю рукою, не шкадуйце працы — каб і мужык быў чалавекам». (Цыт. па арт.: Ракітны В. Сейбіт рэвалюцыйных ідэй. — «Голас Радзімы», 1979, 13 верасня).

Яго «Мужыцкая праўда» узяла на сябе вялікую місію: абудзіць народ, яго нацыянальную свядомасць, прымусіць яго прачнуцца ад векавога сну і ісці змагацца за найвялікшае права «людзьмі звацца». Сам жа сейбіт стаў наперадзе, каб адданасцю, самаахвярным служэннем рэвалюцыйнай справе падтрымліваць люд беларускі асабістым прыкладам. Яго мужнасць і стойкасць з'яўляліся ўзорам для паўстанцаў, узброеных... віламі, косамі, зрэдку паляўнічымі стрэльбамі.

Значыць, з самага пачатку веданне трагічнага выніку? Значыць, з самага пачатку свядомае шэсце на эшафот? Як жа для гэтага трэба было верыць, што новыя выступленні, якія абавязкова будуць успыхваць за іхнімі, дадуць плён, а зрэзаныя царскім урадам і яго памагатымі каласы іх барацьбы, узыдуць зялёнай, маладой рунню, каб ужо не сагнуцца, не зламацца пад жорсткім сярпом самаўладдзя!

Вось як ацэньвае ролю нашага нацыянальнага героя адзін з даследчыкаў яго дзейнасці А. Смірноў: «Гераічнае жыццё Кастуся Каліноўскага з'яўляецца яркім сведчаннем трагічнага лёсу першых рэвалюцыйных дзеячоў Расіі, якія на працягу многіх дзесяцігоддзяў пакутліва шукалі правільную рэвалюцыйную тэорыю барацьбы за шчасце і свабоду працоўнага народа».

Светапогляд будучага рэвалюцыянера-дэмакрата ў многім фарміравала само жыццё, сірочая крыўда, калі ён разам са старэйшым братам быў пазбаўлены ўсякай матэрыяльнай дапамогі з дому. Але гэтаму самаму брату ён абавязаны духоўным ростам. Гады навучання ў Пецярбургскім універсітэце, уплыў ідэалогіі рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў канчаткова сфарміравалі Каліноўскага-барацьбіта. Ён вучыўся ў М. Чарнышэўскага, З. Саракоўскага, быў паплечнікам В. Урублеўскага, кіраўніка народных мас Літвы А. Мацкявічуса. Рэвалюцыйны дэмакратызм поглядаў і дазволіў яму затым узначаліць паўстанне 1863—1864 г.г. на Беларусі. Да гэтага ён з'яўляўся арганізатарам рэвалюцыйнай работы ў Гродна, падпольшчыкам-агітатарам.

Яркасць асобы Кастуся Каліноўскага не можа не прыцягваць да сябе дзеячоў самых розных відаў мастацтва. Але, як гэта і павінна быць, найбольшую ўвагу палымянаму публіцысту, паэту, народнаму герою Кастусю Каліноўскаму падаравала літаратура.

Ужо на пачатку дваццатых гадоў на беларускай сцэне была пастаўлена п'еса Е. Міровіча «Кастусь Каліноўскі», у 1928 годзе зняты аднайменны фільм; адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны (у 1947 г.) у тэатры гучыць опера Д. Лукаса, лібрэта да якой належыць пяру М. Клімковіча. А паэма М. Танка «Кастусь Каліноўскі», а куляшоўскі «Хамуціус», вершы пра кіраўніка народнага паўстання шматлікіх аўтараў! Дадайце сюды аповесць А. Якімовіча, раман «Каласы пад сярпом тваім», аднайменную драму, некалькі вершаў У. Караткевіча, і перад вамі не ўзнікне пытання, ці шануе памяць беларусаў ганаровае імя свайго нацыянальнага героя. Добра будзе, калі з думкамі аб ім мы яшчэ зможам прайсці ў нашым горадзе па новай вуліцы, якая, хочацца верыць, набудзе яго імя. А пакуль, успамінаючы яго зорку на гістарычным небасхіле Радзімы, што гарыць ужо 150 гадоў, памаўчым...

**Чамусьці сёння цішыня такая,**
**Што сесці хочацца**
**І патужыць...**[1]

**В. ШЫНКАРЭНКА,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

[1] Караткевіч Ул. Матчына душа. — Мн., 1958, с. 59.

*Спорт*

## ПАТРЭБНА НЕ ТОЛЬКІ МАЙСТЭРСТВА

У час зімовых студэнцкіх канікулаў пачаліся спаборніцтвы чарговай круглагадовай спартакіяды спартклубаў ВНУ рэспублікі. Першымі ўключыліся ў барацьбу майстры ракеткі і валейбалісты.

Ад выступлення каманд нашага універсітэта засталося двааякае пачуццё. З лепшага боку праявілі сябе тэнісісты. Яны выступілі ў поўную меру сваіх сіл і здолелі заняць шостае месца, якое можна расцэньваць як пэўны поспех.

А вось валейбалісты не апраўдалі надзей. Яны не ўвайшлі ў фінальную групу каманд, якія працягнуць барацьбу за медалі, а будуць асьпрэчваць месцы з 9 па 12. Сярод нашых валейбалістаў сапраўднае майстэрства і байцоўскі характар праявіў толькі чацвёртакурснік з факультэта фізвыхавання Ігар Разанцаў. А вось студэнт пятага курса з фізічнага факультэта Юрый Зотаў і першакурснік факультэта фізвыхавання Васіль Захарэвіч, на якіх рабілася асноўная стаўка, гулялі вяла, безыніцыятыўна і ў выніку каманда цярпела незапланаваныя паражэнні.

**Г. ВАРАТНІЦКІ,**
**старшыня спартклуба ГДУ.**

## З НОВЫМ ЗВАННЕМ!

Ад спаборніцтваў да спаборніцтваў расце майстэрства Людмілы Пух, якая займаецца веславаннем на байдарках і каноэ. Асабліва памятным стаў для яе мінулы, юбілейны для нашай краіны год. Людміла выканала высокі нарматыў для атрымання запаветнага сярэбранага значка «Майстар спорту СССР» і стала першакурсніцай факультэта фізвыхавання нашага універсітэта. Таварышы па вучобе і спорту, трэнеры Л. Пух нядаўна цёпла павіншавалі здольную спартсменку з выпадку прысваення ёй Дзяржаўным Камітэтам па фізкультуры і спорту СССР ганаровага звання «Майстар спорту СССР».

# ЗАПРАШАЕ ШКОЛА «КАМП'ЮТЭР»

Ужо год, як пры матэматычным факультэце нашага універсітэта працуе школа «Камп'ютэр». У яе мы набіраем вучняў дзевятых класаў. Першы выпуск адбудзецца сёлета. Па выніках пачатковага набору ў школу залічылі 45 школьнікаў. Гэта — вучні гарадскіх СШ №№ 27, 37, 43, 49, 14, 22, 33, 5, 19 і інш. З праграмай першага года навучання паспяхова справіліся і працягваюць заняткі 12 рабят. Лепшымі з іх з'яўляюцца Віталь Труцын, Сяргей Падалаў, Саша Кастуноў. Яны ўжо навучыліся працаваць на ЭВМ СМ-4, ведаюць мову праграміравання БЭЙСІК, самастойна складаюць даволі складаныя праграмы.

Заняткі ў школе «Камп'ютэр» дапамагаюць авалодаць асновамі інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі, павышаюць цікавасць да матэматыкі. У размове выкладчык асноў інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі СШ № 37 Ю. М. Кабзар (настаўнік Віталя Труцына) сказаў:

— Заняткі ў школе «Камп'ютэр» добра дапамагаюць у вывучэнні важнага прадмета. Наш вучань Віталь Труцын на раённай алімпіядзе па інфарматыцы заняў прызавое месца. Калі ўлічваць, што ў нашай школе няма ЭВМ, то сярод «безмашыннікаў» яго па праву можна назваць лепшым.

Матэматычны факультэт ГДУ ў другім квартале бягучага года набудзе персанальныя камп'ютэры «Рабатроны». Яны значна палепшаць нашу матэрыяльную базу.

Заняткі ў школе будуць садзейнічаць замацаванню і пашырэнню ведаў, уменняў і навыкаў, атрыманых школьнікамі пры вывучэнні курса «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі». Вялікая ўвага ў працэсе вучобы будзе ўдзяляцца ўдасканальванню навыкаў работы з ЭВМ, умацаванню міжпрадметных сувязей, фарміраванню вопыту па рашэнню з дапамогай ЭВМ вучэбных і навуковых задач з розных галін народнай гаспадаркі.

Выпускнікам школы, якія паспяхова выканаюць праграму, выдаецца пасведчанне, якое будзе ўлічвацца як прафарыентацыйная падрыхтоўка пры паступленні ва універсітэт.

Школа пачынае работу з 22 лютага бягучага года. Працяглaсць навучання — 1,5 года.

Заняткі будуць праходзіць кожны тыдзень у аўдыторыях універсітэта (матэматычны факультэт.) Лекцыі будуць чытацца патоку навучэнцаў, практычныя заняткі — праводзіцца з групамі па 14 чалавек, лабараторныя — з падгрупамі па 7 чалавек. Камп'ютэрнай пісьменнасці навучэнцаў будуць вучыць выкладчыкі кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання, а таксама спецыялісты вылічальнага цэнтра універсітэта.

Вучэбна-тэматычны план школы прадугледжвае чытанне лекцый, правядзенне практычных заняткаў, выкананне лабараторных работ па гісторыі развіцця вылічальнай тэхнікі, яе перспектывах, устройству і прынцыпах работы ЭВМ, па прыкладному і праграмнаму забеспячэнню ЭВМ, алгарытмах, алгарытмічнай мове, мове праграміравання БЭЙСІК, а таксама складанне навучаюча-кантралюючых праграм па матэматыцы, фізіцы, хіміі і інш.

У канцы кожнага семестра (а іх тры), навучэнцы будуць пісаць выпускныя работы, пасля заканчэння ўсёй вучобы— здаваць экзамен.

Заявы можна падаваць на кафедру вылічальнай матэматыкі і праграміравання ГДУ (корпус № 2, аўд. 3—10, вул. Кірава, 119).

Заняткі у школе «Камп'ютэр» пачнуцца у 16 гадзін 22 лютага у вучэбным корпусе № 2, аўд. 2—7а.

**М. ЖАДАН,**
**кіраўнік школы «Камп'ютэр», кандыдат ф.-м. н., дацэнт.**

## ЧАКАЕМ У НАШАЙ КНІГАРНІ

Кнігарня «Думка» (вул. Савецкая, 12) — адна са старэйшых у Гомелі. Больш 10 гадоў яна з'яўляеца спецыялізаванай па распаўсюджванню грамадска-палітычнай літаратуры. У ёй найбольш шырока ў параўнанні з іншымі магазінамі горада прадстаўлена палітычная і сацыяльна-эканамічная літаратура. Тут можна набыць кнігі па наступных раздзелах літаратуры: марксізм-ленінізм, філасофскія навукі, сацыялогія, псіхалогія, атэізм, рэлігія, эканоміка, эканамічныя навукі, статыстыка, дэмаграфія, сучаснае палітычнае становішча дзяржаў, камуністычныя і рабочыя партыі, прафсаюзы, моладзь, арганізацыі моладзі, дзяржава і права, юрыдычныя навукі, ваенная навука, ваенная справа.

У нашу кнігарню паступаюць выданні, якія выпускаюцца Палітвыдатам, выдавецтвамі «Мысль», «Эканоміка» «Фінансы і статыстыка», «Юрыдычная літаратура», «Міжнародныя адносіны», «Навука», «Прагрэс», Маскоўскага і Ленінградскага універсітэтаў, Універсітэта дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы, «Беларусь», «Университетское», «Наука и техника», «Вышэйшая школа» і інш.

Паслугамі нашага магазіна шырока карыстаюцца выкладчыкі, студэнты ВНУ, спецыялісты народнай гаспадаркі, інжынерна-тэхнічныя работнікі, вучоныя, рабочыя, слухачы і прапагандысты сістэмы палітычнай і эканамічнай адукацыі, партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя работнікі.

Доступ да кніг — свабодны, кожны можа адшукаць сабе кнігу для розуму і сэрца, тую, якая дапаможа лепш працаваць і вучыцца, пашырыць гарызонты ведаў.

Калектыў магазіна — маладзёжны. Ён робіць усё для таго, каб наш пакупнік не ўходзіў з магазіна, не набыўшы кнігу.

**І. ЧАРНЯЎСКАЯ,**
**загадчыца магазіна «Думка».**

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**Гомельскі аблвыканком для работнікаў нашага універсітэта на другі квартал гэтага года выдзеліў 5 тысяч штук цэглы на новае будаўніцтва і капітальны рамонт. Жадаючыя набыць названы матэрыял могуць звярнуцца да прарэктара па АГР П. М. Навуменкі.**

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ.**

*Чырвоны святлафор*

## КАБ НЕ БЫЛО БЯДЫ

За мінулы 1987 год на тэрыторыі вобласці адбылося 1167 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 218 чалавек загінула і 1125 — атрымалі траўмы. 169 здарэнняў адбыліся па віне вадзіцеляў, якія знаходзіліся ў нецвярозым стане, з якіх 37 чалавек загінула і звыш 170 атрымалі раненні.

Усім добра вядома, што нават невялікая доза алкагольнага напітку (чарка гарэлкі, кружка піва) зніжае рэакцыю на 30 працэнтаў. А калі ўлічыць высокія хуткасці руху, то лёгка зразумець, што за гэтыя долі секунды, на якія падаўжаецца рэакцыя вадзіцеля, аўтамабіль праходзіць некалькі метраў, якія могуць стаць ракавымі. Замаруджванне рэакцыі назіраецца ў вадзіцеля і на наступны дзень пасля выпіўкі. Вывад тут адзін — п'янства за рулём — злачынства.

Асаблівую трывогу выклікаюць паводзіны пешаходаў. Як паказвае аналіз дарожна-транспартных здарэнняў, практычна кожнае трэцяе з іх адбываецца з-за грубых парушэнняў правілаў дарожнага руху з боку пешаходаў, а ў раённых цэнтрах і горадзе — кожнае другое. Летась па іх прычыне адбылося 326 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 51 чалавек загінуў і 281 паранены. Асноўныя прычыны гэтай бяды — пераход вуліцы ва неўстаноўленым месцы, нечаканы выхад на праезную частку з-за стаячых транспартных сродкаў, пераход вуліц на забараняючы сігнал святлафора і ў непасрэднай блізкасці ад праходзячага транспарту.

Адміністрацыйную адказнасць у г. Гомелі за парушэнне ПДР панеслі звыш 20 тысяч пешаходаў.

Выклікае занепакоенасць і стан дзіцячага транспартнага траўматызму. 30 непаўналетніх пешаходаў загінула і 175 атрымалі траўмы.

Каб папярэдзіць дарожна-транспартныя здарэнні, патрабуецца абавязковае захаванне дарожнага руху і добры прыклад дарослых для маленькіх пешаходаў. Многае залежыць і ад вадзіцеляў. Перш чым пачынаць рух, ім трэба пераканацца, што паблізу няма дзяцей. Калі яны недалёка, трэба папярэдзіць іх, каб былі асцярожнымі. Пры праездзе міма школ, дзіцячых устаноў вадзіцель абавязаны знізіць скорасць.

Толькі агульнымі намаганнямі можна і патрэбна дабіцца бяспекі руху на дарогах.

**А. РАГАЎЦОЎ,**
**ст. інструктар па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ 02143 Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 2000 экз. Заказ 46.